# § 12. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця і яе рэалізацыя ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

§ 12-1
§ 12-2

1. Чым характарызавалася эканамічнае развіццё БССР у канцы 1980-х гг.?
2. Які спосаб пераходу да рыначнай эканомікі называюць «шокавай тэрапіяй»? У якіх краінах ён выкарыстоўваўся?

**Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг.** У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. стала відавочна, што сфарміраваныя на працягу дзесяцігоддзяў эканамічныя адносіны вычарпалі магчымасці для далейшага развіцця. Выйсце з крызісу бачылася ў пераходзе да рыначных адносін. Пры гэтым спробы рэфармавання эканомікі ў перыяд перабудовы (1985—1991 гг.) аказаліся няўдалымі.

Асаблівасцю Беларусі ў канцы 1980-х гг. быў дастаткова высокі ўзровень эканамічнага развіцця. Глыбокі эканамічны крызіс тут праявіўся ў 1991 г. — на два гады пазней, чым у іншых рэспубліках СССР, і працягваўся да 1995 г. уключна.

**Асноўныя праявы эканамічнага крызісу 1991–1995 гг.**

- спад вытворчасці ў асноўных галінах гаспадаркі;
- рэзкае скарачэнне інвестыцый у асноўны капітал;
- рост інфляцыі;
- падзенне жыццёвага ўзроўню насельніцтва;
- павышэнне ўзроўню беспрацоўя;
- рост знешняй запазычанасці

*Растлумачце, у чым заключалася ўзаемасувязь праяў эканамічнага крызісу.*

**Пошук шляхоў выхаду з крызісу.** Яшчэ да распаду СССР кіраўніцтвам рэспублікі рабіліся спробы пераходу да рыначных адносін. У кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў «Праграму пераходу БССР да рыначнай эканомікі». Планавалася, што ажыццяўленне дадзенай праграмы дазволіць Беларусі спыніць спад вытворчасці і дамагчыся яе росту. Аднак мадэль рынкачных рэформ метадам «шокавай тэрапіі» рэальных вынікаў не дала. Сацыяльна-эканамічнае становішча пагаршалася — працягваўся рост інфляцыі і схаванага беспрацоўя.

Па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў 1994 г. быў распрацаваны новы варыянт рэформ. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў «Праграму неадкладных мер па выхадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Са студзеня 1992 г. грамадзянам Беларусі выдаваліся так званыя карткі пакупніка для набыцця прамысловых тавараў. Гэтыя кніжачкі можна было атрымаць па месцы прапіскі грамадзян. Тавары па такой кніжцы адпускалі толькі ў пэўных магазінах, якія былі ў ёй указаны.

*Абмяркуйце, чым маглі быць выкліканы падобныя меры на спажывецкім рынку Рэспублікі Беларусь.*




Візітныя карткі пакупніка. Пачатак 1990-х гг.

з крызісу». Праграма прадугледжвала комплекс радыкальных мер, накіраваных на стабілізацыю эканомікі краіны. У прыватнасці, планаваліся аздараўленне крэдытнай сістэмы, зніжэнне ўзроўню інфляцыі, спыненне спаду вытворчасці і падзення жыццёвага ўзроўню народа. Устанаўліваўся строгі кантроль над прыватнай гаспадарчай дзейнасцю. Эканамічнай стратэгіяй быў абвешчаны «рыначны сацыялізм».

**Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця і яе сутнасныя характарыстыкі.** Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, якая стала рэалізоўвацца з сярэдзіны 1990-х гг., улічвала, з аднаго боку, умовы развіцця Беларусі, з іншага — вопыт эканамічнай трансфармацыі ў шэрагу замежных краін.

Для беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця характэрныя:

— моцная і эфектыўная дзяржаўная ўлада, якая забяспечвае палітычную стабільнасць, сацыяльную справядлівасць і бяспеку;

— роўнасць розных форм уласнасці; галоўны крытэрый развіцця эканомікі — эфектыўнасць вядзення гаспадаркі; прыватызацыя разглядаецца не як самамэта, а як сродак пошуку зацікаўленых інвестараў;

— шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі гаспадарчых сувязей;

— актывізацыя інтэграцыйных працэсаў, перш за ўсё эканамічных, з Расіяй і краінамі СНД;

— моцная сацыяльная палітыка дзяржавы, інвестыцыі ў здароўе, адукацыю, прафесійнае і культурнае развіццё асобы, а таксама адрасная сацыяльная дапамога.

*Нацыянальная эканоміка Беларусі / пад рэд. У. М. Шымава. — 4-е выд. — Мінск: БДЭУ, 2012. — С. 64.*

*Якая роля дзяржавы ў рэалізацыі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гэтая мадэль была накіравана на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі пры актыўнай рэгулюючай ролі дзяржавы.

Адрозная асаблівасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця — захаванне сістэмы планавання, якая дазваляе вызначыць кірункі перспектыўнага развіцця і збалансаваць іх рэсурснае забеспячэнне. Ключавымі элементамі планавання з'яўляюцца Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця і праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь вызначае на доўгатэрміновую перспектыву мэты, этапы і кірункі пераходу Рэспублікі Беларусь да постіндустрыяльнага грамадства і інавацыйнага развіцця эканомікі пры павышэнні стандартаў жыцця чалавека і забеспячэнні спрыяльнага навакольнага асяроддзя. Упершыню яна была прынята ў Рэспубліцы Беларусь у 1997 г. на перыяд да 2010 г. Сёння доўгатэрміновыя перспектывы развіцця нашай краіны вызначае «Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года».

| **Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь** | |
|---|---|
| **Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь** | **Прыярытэты развіцця** |
| 1996–2000 гг. | Экспарт тавараў і паслуг, будаўніцтва жылля, развіццё аграпрамысловага комплексу |
| 2001–2005 гг. | Харчовая бяспека, экспарт, жыллё, інавацыі і інвестыцыі |
| 2006–2010 гг. | Інавацыйнае развіццё эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне, адраджэнне вёскі, павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, развіццё малых гарадоў |
| 2011–2015 гг. | Паляпшэнне інвестыцыйнага і бізнес-клімату, развіццё высокатэхналагічных вытворчасцей, рост экспарту |
| 2016–2020 гг. | Рост канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягненне інвестыцый і інавацыйнае развіццё |
| 2021–2025 гг. | Шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр |

*Абмяркуйце, чаму ў ліку прыярытэтаў эканамічнага развіцця рэспублікі часта сустракаюцца экспарт тавараў і паслуг, павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі, інавацыйнае развіццё.*

*Як вы разумееце прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 2021–2025 гг.?*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь распрацоўваюцца тэрмінам на 5 гадоў. Праграмы шырока абмяркоўваліся беларускім народам і зацвярджаліся на Усебеларускіх народных сходах, якія праходзілі ў 1996, 2001, 2006, 2010, 2016, 2021 гг.

Рэалізацыя праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны забяспечыла захаванне палітычнай стабільнасці, рост нацыянальнай эканомікі, павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей.

Ужо ў другой палове 1990-х гг. удалося спыніць спад вытворчасці. У 2000 г. быў перавышаны ўзровень дакрызіснага 1990 г. па важнейшых эканамічных паказчыках.

Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва на аснове парытэту (роўнасці) пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў у 2010 г. да 20,2 тыс. долараў у 2020 г.

Па індэксе чалавечага развіцця Беларусь перамясцілася з 68-га месца ў 2000 г. на 50-е месца ў 2019 г. (са 189 краін сусветнай супольнасці) і ўвайшла ў групу краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў для краін СНД.

**Беларусь у лічбах і фактах**

**1-е месца** ў рэйтынгу дабрабыту сярод 167 краін свету па тэрарыстычнай бяспецы, узроўні ахопу насельніцтва медыцынскай дапамогай, доступе да мабільнай сувязі  (Legatum Global Prosperiti, 2019 г.);

**1-е месца** ў свеце па вырошчванні бульбы на душу насельніцтва;

**2-е месца** ў свеце па вытворчасці калійных угнаенняў;

**8-е месца** ў свеце па колькасці пісьменных людзей сярод дарослага насельніцтва (99,7 % згодна з рэйтынгам ЮНЕСКА);

**16-е месца** ў свеце па колькасці ўрачоў на 10 тыс. насельніцтва (40,8 чал.) (у рэйтынгу па індэксе чалавечага развіцця (ПРААН, 2019 г.));

**25-е месца** ў рэйтынгу са 179 краін, самых камфортных для мацярынства.

**Дзяржаўная маладзёжная палітыка.** У Рэспубліцы Беларусь чвэрць насельніцтва адносіцца да моладзі (узрост да 31 года). Кірункі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі вызначаны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Асноўныя кірункі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь |
| --- |
| • Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі; |
| • садзейнічанне фарміраванню здаровага ладу жыцця; |
| • дзяржаўная падтрымка маладых сем'яў; |
| • садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на працу; |
| • дзяржаўная падтрымка моладзі ў атрыманні адукацыі; |
| • падтрымка таленавітай і адоранай моладзі; |
| • садзейнічанне развіццю і рэалізацыі маладзёжных грамадска значных ініцыятыў. |

Беларуская дзяржава стымулюе і падтрымлівае будаўніцтва жылля для моладзі і маладых сем'яў праз прадастаўленне субсідый, доўгатэрміновых танных крэдытаў і прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання.



Зводны беларуска-расійскі студатрад Саюзнай дзяржавы на будаванні Беларускай АЭС у г. Астравец. Ліпень 2018 г.

У Рэспубліцы Беларусь маладым спецыялістам гарантуецца першае рабочае месца, аказваецца садзейнічанне ў працаўладкаванні студэнтаў і навучэнцаў (другасная занятасць), падтрымліваецца студэнцкі атрадны рух.

Беларусь — першая краіна на постсавецкай прасторы, у якой на дзяржаўным узроўні студэнцкія атрады атрымалі заканадаўчую падтрымку. Па традыцыі трэці працоўны семестр адкрываецца на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску. З 2003 г. адроджаны БРСМ студатрадаўскі рух аб'яднаў больш за 960 тыс. маладых людзей.

У нашай краіне створана сістэма адбору і падтрымкі таленавітых і адораных маладых людзей. Фінансавую дапамогу і падтрымку ім аказваюць спецыяльны фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі і спецыяльны фонд Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. У рэспубліцы сфарміраваны банк даных адоранай і таленавітай моладзі.

У 2021 г. Урад зацвердзіў стратэгію развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Беларусі да 2030 г. Яе мэтамі з'яўляюцца стварэнне ўмоў для запатрабаванасці

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Стрыт-арт на сценах жылога дома на вуліцы Магілёўскай у Мінску, прысвечаны сяброўству Расіі і Беларусі

моладзі ў краіне, узмацненне далучанасці маладых грамадзян да рэалізацыі дзяржаўных задач па грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі.

**Эканамічная інтэграцыя з Расіяй і краінамі СНД.** У шматвектарнай знешняй палітыцы Беларусі прыярытэтным з'яўляецца супрацоўніцтва з Расіяй — асноўным эканамічным партнёрам краіны. Цесныя эканамічныя сувязі паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй усталяваліся пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 г. Ідэю эканамічнай інтэграцыі з Расіяй грамадзяне Беларусі падтрымалі на рэспубліканскім рэферэндуме 1995 г. (82,4 %).

Развіццю эканамічных сувязей садзейнічалі падпісанне Дагавора аб стварэнні Садружнасці Беларусі і Расіі ў 1996 г., Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі ў 1997 г., стварэнне Саюзнай дзяржавы 8 снежня 1999 г. Важнымі перадумовамі эканамічнага ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі з'яўляліся тэрытарыяльнае раздзяленне працы і спецыялізацыя і кааперацыя эканамічных сувязей, якія склаліся на працягу многіх дзесяцігоддзяў у рамках былога СССР.

*Сфармулюйце прычыны, якія абумоўліваюць неабходнасць эканамічнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.*

На Расійскую Федэрацыю прыпадае каля паловы знешнегандлёвага абароту Беларусі. Адтуль Беларусь імпартуе паліўна-энергетычныя рэсурсы (нафту і газ), металы, машыны і абсталяванне. Аснову беларускага экспарту ў Расію складаюць транспартныя сродкі (аўтамабілі, трактары), прамысловае абсталяванне, тэкстыль, мясныя і малочныя прадукты, кандытарскія вырабы. Больш за 8 тыс. беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў сёння звязаны ўзаемнымі пастаўкамі прадукцыі.

«Мы хочам, каб трактары „Беларус“ і аўтамабілі БелАЗ сталі канкурэнтаздольнымі на сусветным рынку. І тады праца цэлых пакаленняў расіян і беларусаў будзе недарэмнай. Мы хочам, каб цюменская нафта ішла на экспарт пасля яе перапрацоўкі на Наваполацкім камбінаце. І тады стануць багацейшымі і расіяне, і беларусы».

*Прэзідэнт РФ Б. М. Ельцын.*
*2 красавіка 1996 г.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Саміт Еўразійскага эканамічнага саюза ў Ерэване. 1 верасня 2019 г.

За апошнія некалькі гадоў тавараабарот паміж нашымі краінамі паказваў устойлівы рост. Так, у 2018 г. ён складаў 35,5 млрд у доларавым эквіваленце, у наступныя гады рост тавараабароту працягнуўся і, па ацэнках экспертаў, да 2020 г. складаў 45 млрд долараў.

Паліўна-энергетычныя комплексы Беларусі і Расіі інтэграваны на 95 %, машынабудаўнічыя — на 85 %, сельскагаспадарчыя — на 65 %, будаўнічай індустрыі — на 80 %. Доля Расіі ў знешнім гандлі Беларусі перавышае 50 %.

Развіццё двухбаковых адносін з краінамі СНД таксама з'яўляецца адным з асноўных знешнеэканамічных прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь. Паслядоўна адстойваючы ідэі інтэграцыі, Беларусь займае актыўную і канструктыўную пазіцыю ў працэсах аб'яднання на постсавецкай прасторы. 29 мая 2014 г. Расія, Беларусь і Казахстан падпісалі дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС). Ён набыў моц 1 студзеня 2015 г. У гэты ж год членамі ЕАЭС сталі Арменія і Кыргызстан. У рамках ЕАЭС забяспечваюцца свабода руху тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы, правядзенне скаардынаванай, узгодненай альбо адзінай палітыкі ў ключавых галінах эканомікі.

**1.** З якімі эканамічнымі праблемамі сутыкнулася наша краіна ў 1991—1995 гг.?

**2.** Існуе такое меркаванне: пагаршэнне эканамічнага становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. было звязана з тым, што БССР з'яўлялася «зборачным цэхам» Савецкага Саюза. Як вы разумееце гэтае сцверджанне? Ці згодныя вы з ім? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

Праваабладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** У чым праяўляецца сацыяльная арыентацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця?

**4.** Падрыхтуйце паведамленне (або прэзентацыю) аб рэалізацыі прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1996—2020 гг. у вашым рэгіёне.

**5.** Знайдзіце інфармацыю ў СМІ аб рэалізацыі грамадска значных ініцыятыў моладзі Беларусі. Якія з іх рэалізуюцца ў вашым рэгіёне?

## Абагульненне па раздзеле «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі»

Наш край

Абагульненне па раздзеле II

### Працуем з вучэбным тэкстам

**1.** Выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка і пры неабходнасці дадатковыя крыніцы, растлумачце, чаму цяжкая прамысловасць, якая не атрымала належнага развіцця ў 1920—1930-я гг., стала адной з вядучых галін у беларускай эканоміцы ў 1950—1970-я гг.

**2.** На аснове тэксту вучэбнага дапаможніка вызначце, якія кірункі маладзёжнай палітыкі вы б вылучылі як прыярытэтныя і чаму. Дапоўніце іх канкрэтнымі прыкладамі і прадстаўце ў выглядзе калажа (выкарыстайце надпісы, ілюстрацыі, фотаздымкі, малюнкі і інш.).

### Працуем з паняццямі

**1.** Выкарыстоўваючы лагічныя кругі, вылучыце агульнае і адрознае ў наступных парах гістарычных паняццяў:





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ